**ПО́ЛАЦКІ ВЕ́РХНІ ЗА́МАК**, археалагічны помнік на правым беразе р. Зах. Дзвіна пры ўпадзенні ў яе р. Палата. Займаў узвышша пл. 9,44 га. З У быў абкружаны валам, па краі пляцоўкі ўмацаваны драўлянымі сценамі-гароднямі з вежамі. Схілы неаднаразова ўмацоўваліся – «тамаваліся» (паводле археал. даных, упершыню каля 1363). Даследавалі ў 1928 А.М.Ляўданскі, у 1957 М.К.Каргер, у 1959–60 А.Р.Мітрафанаў, у 1961–62 В.Р.Тарасенка, у 1967 і 1980 Г.В.Штыхаў, у 1966–67 М.К.Каргер, у 1975–79 Вал.А.Булкін, у 1989 і 1993 С.В.Тарасаў. Археал. нагляд у 2002, 2007 ажыццяўляў Дз.У.Дук, у 2009 – А.А.Салаўёў. Даследавана больш за 2000 м². У 11–17 ст. Верхні замак – умацаваны цэнтр Полацка. Да ўзвядзення драўлянай царквы (1-я пал. 11 ст.) і Сафійскага сабора (каля 1044–66) тут размяшчалася язычніцкае свяцілішча. Пашырэнне Верхняга замка адбылося ў 14–15 ст. за кошт пасадскай тэр. на месцы т.зв. усходніх раскопаў 1950–60-х г. У пач. 14 ст. пасля пераносу сюды княжацкай рэзідэнцыі з *Полацкага гарадзішча* набыў статус дзяцін-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ца. З'яўляўся месцам палітычнай дзейнасці князя (11–14 ст.) і яго пражывання (пасля 1326). На Верхнім замку жылі княжацкі намеснік (з 1392), ваявода (з 1504), полацкі епіскап, баяры і мяшчане. Абарончыя сцены 14 ст. ўяўлялі сабой пастаўленыя адзін да аднаго драўляныя зрубы-гародні. Схіл натуральнага пагорка, на якім размяшчаўся замак, быў умацаваны адмысловымі драўлянымі ступенямі-накатамі, адлегласці паміж імі засыпаліся глінай. На Верхнім замку будаваліся цэрквы і манастыры.

*Літ.*: Дук Д. Святая София о седми версех // Родина. 2007. № 6; Лобач У.А. Да пытання аб сакральнай тапаграфіі старажытнага Полацка // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (24–25 кастр. 2007 г.). Полацк, 2009.

*Дз.У.Дук, С.В.Тарасаў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова